# ЖМЕНЯ ПЯСКУ

# Ян Чыквін

## ЖМЕНЯ ПЯСКУ

БЕЛАСТОК 2008



***

Поле з недаспелым жытам-хорам
Песнямі стварала шыр прасторам.

А пад намі вечнасць і над намі далі
Незавершанымі душу вабілі агнямі,
Вогнівам свяціла ў змроках на айчыне.

Але цела сокамі бяроз напоенае, шумам соснаў
Не хацела ні ўміраць, ні уваскроснуць
І спявала ў полі жытнімі вачыма.

Па шахліва-утрапёнай сферы быту
Поруч ты ішла ў маленні варажбітным
Нібыта анёл, што вядзе к жыцця берагавіне.

***

Вецер дыхаў хвалямі цяпла,
Жыццём нясконачаным свабодна плюскаў.

Яна стаяла ў просвеці акна
І гаварыла з кімсьці як бы па-французску.

Хоць паўсюль была адно крылатая вясна
І Аргус-пёс сцярог яе аргусна,
І вінаград ўгору поўз па ўсёй сцяне.

І варушылася наўкол жыўё, і плюскат
Ягонай хвалі пры маіх нагах
Такі пахуча-радасны, такі прывабліва-жаданы
Быў, што я, прывідам падмануты, закалыханы,
Рукамі прабаваў усё злавіць, што млела прад вачамі,
Хоць гэта вецер толькі быў і ў нікуды дарога,
І час ацеплены знутры вясны – і больш нічога.

А ці імгненне тое будзе помніць пра мяне?!

***

Народжанай ад Марыі-птахі

Агню ўладарніца на кухні, пры пліце
Вадою хрысціць звонкае начынне,
Як быццам вяжа серабрыстых два канцы ніцей,
Як быццам сузірае нешта ў слёзных далячынях.

Вада, як час ў быцці-чарнавіку магутным,
Цячэ праз пальцы перламутрай.

Нібыта цені вадзяныя
Калышуць люстра маладосці –
І рвуцца прадзінкі жыцця жывыя
Ў руках князёўны-гаспадыні...
Ці новыя ўзоры ткуцца госцяй?

***

Над ракою Нарвай
Не гояцца раны.
Тут памёр мой сябра
Вадой закалыханы.

Вада, як у Іярдане,
Што й дух амаладжае...
І каменем кане
Ў вадаваротах люстра.

Ціхінёй дрыгвянай
Зноўку дрэмле Нарва –
Кніга ўканавання
Айчынных абшараў.

***

Неўзабаве
Зарэжам пеўніка –
Адсвяткуем дзень нараджэння.
А ён ці  ведае...

***

У Бельску адліга і змрок.
У цёплай зіме шмат жуды;
Як ў кнізе кніг чуецца вохк
Па днях справядлівай хады.

Хто прыйдзе наведаць мяне сюды,
Адкуль я сам амаль што ўцёк?
Зіма яшчэ, а йдуць дажджы,
І скон ідзе, хоць уладарыць ім жыццё.

Прыгожа самота далін і гарын,
Кароткачасовых, як ўсё на свеце.
Змрочны, адзеты ў кажушак авечы,
Іду па тала-няпэўным двары.

У хаце завалы зрудзелай бяды.
Душа зыходзіць кругамі шматліха
Туды, дзе жменямі чыстай вады
Зіму разбурае адліга.

***

Гадоў мінае новых чарада.
Зноў ідалаў паставілі на варце...
Не, спадары хтанічнага жыцця,
Маім жыццём вам не ўладарыць!

Іграе музыка святла й нябёс,
Якую заглушыць – кароткі вашы рукі!
Няхай здаецца вам, што Ён не ўваскрос
І што гармоніі няма ў душэўных муках.

А ўсё-такі, калі заляжа ноч наўсцяж
І лекар не пакіне вам надзеі,
Не срэбнікаў і золата ўчэпіцца душа,
А вышняе спадзевы.

***

Сёння вечны на свеце аўторак.
Асыпаецца ноч на падворак,
Хтосьці топчацца ў слізкіх галошах,
Чорна-ціхі і глуха-трывожны.

Нешта сталася з сонцам высокім,
Памяняўся напрамак у свеце,
Ноч адкрыта ў ставокія жахі.
Душа-начніца не прачнецца,
Пад неба не шугне свабодным птахам.

Незавершаны будовы лесу,
Незакончаны будынкі мараў...
Ды паўтараецца, як святая меса:
Нераны любуюцца відовішчам пажараў.

***

Я люблю глядзець,
як кожны дзень
з маіх рук
з’ядае свой сняданак
мой неадлучны спадарожнік.

Кожнай раніцы
няведама адкуль злятае
ён – неадменна той самы,
шырокакрылы, непадкупны
і вечна ненаедны.

Я прывык да яго
маўклівай прысутнасці,
чакаю, не дачакаюся....
І ён штораз часцей
прылятае кляваць...

***

Здаецца мне, што я іду па Саскім*.
Гады велікодныя ў сонечным ззянні,
Прыгожа варушыцца свет пакаяння,
Рэха разносіць мелодыі наскія.

Ах, гэты сад пад нядрэмным вокам Венеры
Мяне назаўсёды з Польшчаю вяжа.
І адсюль я адразу бачу ўсё разам,
Што ў замыслах боскіх, а што на паперы.

Здаецца, шлях у бясконцасць адкрыты, у нескаронасць,
Гады маладыя на ўзлёце сіл духа...
Ды чуеш, як цісне паціху абруч сталёвы,
Як крыўда на сэрца кладзецца сваім невагомым пухам.

І як ні ідзі ты, а будзе твой шлях заўжды па ўскрайку,
Бо ты адтуль, дзе толькі актавы болю і скрухі...
І ты, як кастрычнік, палка ўспылаўшы,
Сваю маладосць у вогнішча дзён ярэмных кідаеш.

---

** Парк у цэнтры Варшавы*

## Паэт і прарок

Нармальныя, відаць, і нашы людзі:
Памрэ паэт – аплакваць не будуць,
Не ў змозе прачытаць яго высокіх запаветаў.
А мо не хочуць ведаць самамэтна,
Куды ён кліча ўжо ад веку чалавека?

Яны ідуць нібы авечкі
На зык трубы свайго прарока...
Дык што ж, што крывадушны ён і аднавокі?!
Яго партрэты, змазаны ялеем,
У іх руках на вуліцах і асамблеях.

Такім узносяць маўзалеі.
І, збудаваўшы, кленчаць прад іконай-тастаментам.
І палка б'юць сябе ў грудзі
Нармальныя ўсе тыя людзі,
Якім на ліха ім звычайныя паэты.

***

віхраць нясветныя віхуры
і зграй арнаўдаў хвалі муціць
са сноў распорхнутых імкнуцца
сістэмы новай Беларусі

на флейт губах гарчыць рагнеда
вялемы спераду рухлёвы
міталягемы родзяцца нанова
сівых паўхлопчыкаў і печанегаў

салён карлгофавы ў пеньюры
рыхтуе смачыненні рдулі
мяўкотна пруць з дзвярэй у дзверы
ахвосталы, пралокі, мыш'янэры

мрамруць даносныя данайцы
ў сянаклях пэндзляй сцяг адплошчуць
з басоў спушчаюць нашых самых дбайцаў –
бягуць глядзець на свае мошчы

***

Ні слова добрага нідзе –
тут найлагодная ўсім кара.
А найчасцей затопчуць, ў пыл сатруць, заб’юць
На вуліцы ў натоўпе ці ў лякарні.
О, доўгія шчупáльцы палітычных юд!

Спацелыя ад бруду рукі новых нажывалаў,
Сакрэтных змоў, абмызганых лычоў...

“Улада наша ўжо над светам-рэстаранам!
І ўставім-павернем розум і пячонкі;
І пойдзеце, ўсе шчасныя, вайсковым крокам
Пад нашу музыку, у свой астачарцелы рай;
Мы ўчалавечым вам патрэбных вам прарокаў;
І будзеце, як дзеці, ўрэшце роўныя сваім багам.

І дзякаваць нам будуць усходнія й заходнія народы.
І страшнага суда не будзе ўжо ніколі вам!

...калі ж на то не стане вашай згоды –
Як у старажытным Рыме, першых хрысціян – ільвам!”

***

Мы ўехалі ў балотны Беласток,
І згасла музыка пейзажаў свойскіх –
Нязведаны шляхі господне-боскія!

Бразгоча-прэ наперад нашая квадрыга,
І колы круцяць нейкую нібы сюіту Грыга,
І шмат людзей на ходніках нібы расстрыгі.

На паваротах з мудрасцю аслінай сам кіруе воз.
Аднак, чаго мы селімся ў гняздо чмялёў і вос?
Ці што тут вырасла калі – апроч сварак і пагроз?

Па ўсім паселішчы паўсюль зачыненыя дзверы.
Ніхто нам не адчыніць іх – няхай яны б згарэлі...
Свайго шкадуем соладка, а іншых шлем ў халеру.

Куды і хто ў бляшанай пуставатай скрыні
Вязе душу й галованьку маю, як на прадажу дыню?!
Чаго схацелась нам у мёртвыя абдымкі?

А нехта ж сунецца назад, шчаслівы, у сваё ваколле,
Рукой махнуўшы на жыццё паводле пратакола –
Як голуба, сваю душу пускаючы на волю.

А я важу сябе туды й сюды – з паўвёскі у паўгорад,
Бо ўсё на свеце ўпісана у форму вогненнага кола,
Якое круціць Саваоф, а часам і святы Мікола.

***

“Бярнар швырнуў, – напісаў Мапасан, –
Жменю пяску у вакно”, каб збудзіць капітана –
І выйшлі на яхце ў мора яны прад світаннем;
Над Ніцай віселі хрыбты паўзаснежаных Альп;
Не задавай аніякіх пытанняў, марак, небакраю!

І ўсё далей адплывалі ў напрамку містраля,
І ўсё радзей даганяў благавест ад святых ім званоў...
Іх час паганяў, і жыцця заставалася мала,
Каб вышні намер зразумець, і яго
Каб сэнсам напоўніць дагэтуль пустыя скрыжалі...

На ціха адкрытых прасторах зямлі і нябёс
У Ніцу вясна завітала, святая няўмольна;
Жанчынам у храме здалося – Хрыстос,
Як жменю пяску, іх трымае ў далоні.

***

Мы зрабілі памылку –
нарадзіліся не ў той краіне,
не ў тым часе,
не ад тых бацькоў;
спявалі не тыя песні,
не тыя малітвы,
не пад тымі сцягамі;
ішлі не ў тым напрамку,
не на тых ворагаў,
ніколі не з тымі, што трэба.

Заўсёды паміж
*напэўна* і *мабыць*.

***

...wunderliche Zeit
von Widerspruch zu Widerspruche reichend
*Rainer Maria Rilke*

Сонца згінае ў дугу вялікае неба,
Вяжа ў вузел тугі ўсе супярэчы.
Мы рукамі разганяем цені
І глядзім на свет маўкліва,
Нібы свае, нібы чужыя людзі,
Як дзень глытае пыл серабрысты аблокаў,
Аблокаў...

Новых прадвызначэнняў у высях не будзе;
Замкнёныя ў прасторах Эўкліда
Раны жыцця адно жыццём і лечым –
Мо здарыцца душ перасяленне,
Мо зыдзе агонь святы  здалёку...
Галя чытае мне голасам Рыльке: O, Leben,
Leben...

***

О, шчаслівыя жыцця бязмэтныя часіны!
Бацька зросся з возам, лес з кабылай,
Колы шорхна рушаць цёплы порах пылу;
Поўдзень. Час нібыта ў сне – то явіцца, то гіне;
Едзем па цячэнні дня ўсё той жа вечнай каляінай.

Цішынёй няспешліва-гаючай сцелецца дарога,
Бацька на калодах дрэмле, чуб адкінуўшы на вецер...
Конь спакойна мерыць невымернае у конскім свеце,
Роўна тоўхкае нагамі пыл, галавой трасе і зірыць яблавока,
Як паперадзе паўз пыл вядуць нябожчыка да Бога.

***

Свет спахмурнеў, сабе нібыта не рады.
Промні з фарбаў зышлі ў нябачнасць нірваны.
Вобраз глядзеў сам з сябе ў свет дараваны.
Чым далей ад яго, тым болей зыходзіла дзіва-здагадак.

Раптам нехта ўвайшоў, варухнуўшы чэрава дня,
Калынуўшы часіны жыцця, як цені кляновага лісця.
Чутна дыхала звочнасць быцця, якое нам нехта даваў
І дзе сам абраз з абраза непарушна сюдзіў святлістасць.

***

Дзень пры дні – тужлівая жура,
Ўсё як бы разгублена й разбіта.
Вось дзе мне прыйшлося нарадзіцца й паміраць,
Вось той шлях ад крыку першага і да апошняе малітвы.

Што зрабіў ты са сваім жыццём? – сябе пытаю.
Быццам ў поле выйшаў,  дзе туман ляжыць...

То паўсюль, паўсюль жыццё жыццём дажджыць
І мяне ад берагоў сваіх яшчэ аберагае.

***

Адчуў, што сам як светлае начынне,
Якое прагне чыстае вады...
І вечар зноў заводарыў жанчынай –
І стаўся малады.



*Эскіз тушшу: Аляксандр Хомчык*

***

Яблыні гнуцца ад яблык.
Гнуцца, ніяк не сагнуцца.
– Як твае дзеці завуцца?
Сын твой, можа, мой гэты Паўлік!?

Падаюць слівы пад сліву,
Як з чэрава коцяцца дзеці.
Нібы ў траве шукаю, дзе трэцяе...
Як без мяне ўсе раслі вы!?

Восень спеліць цукровыя грушы,
П’яна-салодкія шэрыя бэры.
Выспеліць – і зачыняцца дзверы
Ў гэты сад няздзейсненых душаў.

***

Восень у Бельску і ў Крынках,
у нашых весях і на ўзбярэжжы.
Прыгожа-плаксівай дзяўчынкай
яна выйшла з лясоў Белавежы.

Ідзе напрасткі праз поле
знаёмай сцежкай да Нарвы,
каб сіняй напоўніць вадою
усе свае цудныя барвы.

Што так доўга малюеш імглою
і бронзаю тчэш габэлены?
Дзяўчына стаіць удавою
перад зімой на каленях.

## Жанчына-ноч

На чарэні чорнае кіпіць,
То вылiваецца, то наліваецца...
Шчаслівіца сама сябе самую сніць,
Валосіцца, махаецца
Ад вечара да раніцы...

А я сабой цябе трымаюся
І спаць з табой хачу,
То падаю, то ўверх лячу,
Ніяк не развітаюся,
І зноў чаплю няўмела,
І б’юся аб тваё вакно,
І ўсё імкнуся ў тваё цела –
Не крукам, а верацяном.

## Не проза, не вершы

Калі ўбачыце твор напісаны, то, па-другое,
гляньце, хто падпісаўся і чым – крывёй ці потам?
Калі крывёй – напэўна шмат у ім благога,
калі ж потам – адкладзіце на вечнае потым.

І яшчэ ж застаецца сутнаснае, першае –

Калі аўтар вам блізкі сваім ладам тварэння,
прозы ягонай лепш не чытайце, толькі вершы,
і нават не вершы, а лірыку. А з яе – найлепшае,
адкуль ідзе прасветлае яўленне!

***

І вось канчаецца жыццё –
        і мы з ім нібы квіты!
Яно мне – ўсё, спаўна, да дна,
а я яму – неразумення млосць.

Дабро і Любасць, Вера й Прыгажосць,
амаль што й непачаты мною,
стаюцца на вачах нябытам.

Не так, не так задумаў быў мой Бог,
як выйшла, як збылося!

Яго адзінавольны рукатвор,
нібыта нейкі чарнавік,
няўцямна ўласнымі рукамі
я з дня ў дзень псаваў як мог.

***

Вечар плыве па двары лодкай Харона.
Перавозчыка вёслы
мерна бягуць па вадзе жыцця.
Мілая, што гарыць там
і разгараецца ў нашых сэрцах такое,
што, чым болей згарае яно,
тым больш застаецца згараць?

Час паўзе за вакном нібыта змяя,
ноч вісіць над зямлёй, як той авадзень.
Мілая, як нам у цемры паняць
гэты сонечны блік, што плыве па вадзе?

За вакном і ўва мне разліваецца хорамі сум,
светлы сум, што ўмее душы вянчаць.
Я пайду, каб вярнуцца, і  адтуль табе прынясу
вестку, што смерці нельга пазбегнуць і нам, відаць.

***

Жыцця шмат дадзена ўсім!
Але ў самім жыцці – адно слязіны,
і не жыцця, а горычы палын
на дне атрутнага начыння.

О, Божа праведны, павер
маім няўтольным нараканням!
Падай віна, калі спашлеш канец,
слязу сатры са шклянкі.

***

Як камень, што ўніз імкне,
сапхнуты нагой з вышыні,
каб разваліцца ў пыл і тло –
здаецца, так выпала мне.

Падняты з сагнутых каленаў,
распалены палкім цяплом,
жаночай ціхай пяшчотай, –
лячу па жыцці бестурботна,
нібыта сам сабе паўшы анёл.

***

За вакном развіваецца клён,
над сабою трымаючы просінь;
Хоць трапеча ён новым лісцём –
у лісці палымнее ўжо восень.

Сэрца б’ецца нібы ў юнака,
і ў вачах тыя ж іскаркі жарсці;
О, каб мог я твой бярозавы стан
абняць клянова-вясняным пажарам!

***

Недзе там, дзе нас няма, у іншых актавах
сядзяць пры пустым стале адсутныя мама і тата.

Сядзяць – і вечнасць ім тчэцца сувоем змярцвелых,
І меней ўсё іх, і меней, і ўсё звіваецца цела.

І моўчкі ўваходзіць Антоні, садзіцца ля цесця,
прайшоўшы ўсе вузкія дзверы да вечнага месца.

Сядзяць, бы чакаюць – без сонца й вадзіцы –
калі паўсплываюць знаёмыя цені ў вачніцах,

калі зноў паціху з’явіцца нехта, правы й неправы,
пры тым стале, дзе прах жывы нежывых, у тонкіх актавах.

***

Назірае за намі нехта,
За мной назірае;
Назіраюць назіры,
Нашыя сьвіры.

Былі часы найгоршыя,
Насталі нам найлепшыя.

З гвалтам ідуць і свістам
Рухам паўзучым, слізкім
З правінцый, прадмесця хлопцы;
І чакаюць гразілы,
Чакаюць яны цярпліва,
Каб усяму свету адпомсціць.

І зноў з часоў найлепшых
настануць – яшчэ лепшыя.

Усеабдымна і акруглiста
У вочы яд пускаюць, дым,
Набраўшы ў рот вады,
Двурушнікі-міністры:
Усіх злавіць і сціснуць,
Каб ўжо ніхто ніколі, ні адзін...

Былі ж часы і горшыя –
Не тое, што цяпер.

Куды ні йдзем мы, брацця,
Ці робім, ці ляжым,
Усюды – у жорсткіх абнятках,
Паўсюль, паўсюль рэжым,
Аж хочацца скрыгнуць зубамі
І рваць на сабе апратку.

І зноў з часоў найлепшых
настане судны дзень.

***

Запрасілі нас у госці,
у гасподу дзесьці –
ні стала, ні піць, ні есці...

Сабраўшыся з духам
у цеснай плоці,
мы заказалі пагрызці
локці.

***

Бывае, кінем слоўка нібы без разбору –
і раптам, глянь, яно расце і пнецца ўгору,
і побач родзічаў яго аблогай хмара,
і ўжо не ты – яны дыктуюць-валадараць.

Аднак няма для нас падзеяў выпадковых –
і нават тое, ці маўчым ці што сабе мы кажам,
няўлоўнай сілай нас, як рыбу ў сеці, ловіць
і з выпадковасцей прабоскіх ў цесны вузел вяжа.

***

Трава пазелянела на вачах,
узыйшло вясенняе свяціла;
музычным трохвугольнікам ляцяць
прадвеснікі паўторных нарадзінаў.

І паўторыцца жыцця тварэнне –
развеціцца ды зноў растае,
нібыта з выраю ў вырай пералятаюць
душы святочныя маленні.

Паўторыцца усё, усё – да донца слёз –
палёт, цвіценне, крыкі з гнёзд
і песня роспачы, каб хоць на міг забыцца,
што свет для нас не паўтарыцца.

## Тры фатаграфіі

Мама прысела на сходках
у жоўта-ветранай кофце,
над ёю ліпаў ліпнёвых вохкасць
і цішынёвая радасць;
ля ног – на зямлі сабака.

Дочкі ўсе адышлі, каб паплакаць,
сыны – паправіць прычоску.

А ў вачах валошкавых –
над Волгай далёкай
усё бяжыць тугой дарога
праз поле, праз спёку,
і не можа ніяк спыніцца
перад дзяўчынкаю босай.

Мама сядзіць на сходках
і бачыць, што ёй сніцца.

***

Вечар – гарачае сэрца
спіць на свежым сене,
месяц над ім па-суседску
свеціць, але не грэе.

Сніцца вечару донне,
ніць пацалункаў-трымценняў,
як пояцца коні вадою,
як доўга жуюць яны сена.

Ноч стаіць на каленях,
цалуе вечара вусны,
і вечар стаецца небам,
а неба – азёрным люстрам.

Такой вечаровай хвілі
не шкода ні плоці, ні духа.
І вечар сам з чорнае вілы
любіць сябе на вуха паслухаць.

## Кропля сну

Бачыцца  мне, што Шаховіч ідзе па моры,
Па калена ў вадзе, у руках – залатая рыбка,
Нібы з Сакоў сваіх утравелаю сцежкай у горад,
Дзе Насця яго ўсё тчэ для іх дваіх светлы лёс-кілім,
Ды без Міхася не можа ніяк яго выткаць.

Прачнуўся... Успомніць, што сніў, было марна:
То стогны хваль, то сонца гудзеў пераможны звон
І падаў ды падаў ў ваду бераг янтарны,
Па якім, выйшаўшы з водаў, ішоў да мяне невідзімкай
Стары чалавек з маладым жыццём.

## Ноч і месяц

У Бельску далёкім (ад чаго? ад каго?
Ад цябе, ад Бога ці нейкай зямной улады?)
Ноч паслала месяц у наш гарод
Намаляваць ноч, якой яна сама сабою не рада.

– І каб тая ноч і ў дзень была як сажа,
І каб паўсюль шугаў агонь і душнае цяпло,
І каб кожны сон схаваўся у дупло
Сваёй бяссонніцы ды сеяў роспач-жаль сярмяжны;

І каб  была бясплодным краявідам без канца і краю,
І каб там жах ажыў, ад чаго халоне сэрца і нямее;
І каб ніхто не ўздумаў пра ўцехі раю,
Каб стагналі глуха бубны, нёсся рваны брэх сабак...

– Там такой начы няма-к!
Такой начы я маляваць не ўмею!

## Камень

Камень на дне ракі,
чырвоны, як вока рыбы,
нярухам плыве праз вякі
навечна рухлівым няплывам.

– Вымі мяне з глыбіні,
з вечнасці мяне выкінь;
дай  мне маё імя,
вырві з бясконцай плыні!
Каб мог я ў неба ўзляцець,
лёгкі, як пух лебядзіны! –

Камень плыве па вадзе
і вечнасць глытае вокам рыбім.

## Натуршчыца

Пікасо малюе з натуры жанчыну
з Манмартра. Вочы — вабна смяюцца,
вусны  раскрыты; блудніца – яна,
неўтаймаванае красы рухлівае начынне,
з якога аж бруіцца слодыч п’янкага віна.

Ён падышоў, натуршчыцу каб асцярожна,
ледзь даткнуўшыся яе пляча,
перасунуць з ценю здраднага ў святло.
– Мамзель, ці то не ваш партрэт з Палаца Дожаў
як сёння, у маіх гарыць вачах?
– Той самы, мсё. Ад тысячы гадоў...

***

Цяпер, калі разам
са светам і я пастарэў –
хоць не на толькі, каб вочы
мае не бачылі хараства тваіх вачэй
і не адрознівалі часу ад прасторы –
кожны дзень
я паўтараю, як малітву:
роднае мяне выратавала!

Дзе былі мы народжаны,
у цэнтры сусвету,
дзе вечна ўстае
і велічна заходзіць
нашае сонца,
і жыватворыць тайну
вокадух.

***

Даўні вечар шуміць за вакном,
замяняецца ў дождж, ва ўспаміны,
у слодыч самоты, якая згубна даўно
сэрца займае балючым уздымам.

Што ж ты – сама па сабе,
ў сваім свеце далёкім!
І здрадна дзеліш радасць з турботамі:
дзень за днём тчэш пахавальную світку,
а ноччу пораш яе нітка за ніткай.

***

Мокне пушча ў струменях дажджу
пад маланкавым зяхам за зяхам.
Зноў багі па-над намі высока вязуць
тых, што маюць тысячы год у запасе.

Разам з намі цвіце ў ціхіх муках вясна,
п’юць ваду два чырвоныя пеўні –
певень радасці-крыку быцця
і певень нязбытнага сну;
Вечнасць ляжыць змяёй унутры святла
і сцеле дарогі, якія пад намі бягуць.

– Дык няхай жа крычаць вадагады ў вадзе,
і няхай жа ў небе багі грукацяць;
Мілая, ў гэтым свеце мы блізка сябе,
намі корміцца голад жыцця!..

## Маладыя гадзіны

Пры стале адным і адзіным
Сядзелі дзве маладыя гадзіны:
Гадзіна жыцця і гадзіна смерці.

Як родныя людзі, зышліся ў хаце
Гадзіна-дачка і гадзіна-маці,
Такія малыя, абедзьве як дзеці.
Над імі – адно і для іх Распяцце!

Жанчыны, якім усяго мо гадзіна,
Гадзіны, якія ва ўсім як жанчыны.
Ва ўсім, ва ўсім не болей хвіліны.
Адна крылата, другая –
                    з пустымі вачыма.

І хоць растуць яны хвіля за хвіляй,
А ўсё ж як паселі малымі, так і сядзелі
У сіне-багровым святле надзеі
Вечна дзве маладыя гадзіны-падзеі.

# ЗМЕСТ

*** (Поле з недаспелым жытам-хорам...) 5
*** (Вецер дыхаў хвалямі цяпла...) 6
*** (Агню ўладарніца на кухні...) 7
*** (Над ракою Нарвай...) 8
*** (Неўзабаве...) 9
*** (У Бельску адліга і змрок...) 10
*** (Гадоў мінае новых чарада...) 11
*** (Сёння вечны на свеце аўторак...) 12
*** (Я люблю глядзець...) 13
*** (Здаецца мне, што я іду па Саскім...) 14
Паэт і прарок 15
*** (віхраць нясветныя віхуры...) 16
*** (Ні слова добрага нідзе...) 17
*** (Мы ўехалі ў балотны Беласток...) 18
*** (“Бярнар швырнуў...) 19
*** (Мы зрабілі памылку...) 20
*** (Сонца згінае ў дугу вялікае неба...) 21
*** (О, шчаслівыя жыцця бязмэтныя...) 22
*** (Свет спахмурнеў, сабе нібыта...) 23
*** (Дзень пры дні – тужлівая жура 24
*** (Адчуў, што сам як светлае...) 25
*** (Яблыні гнуцца ад яблык...) 26
*** (Восень у Бельску і ў Крынках...) 27
Жанчына-ноч 28
Не проза, не вершы 29

*** (І вось канчаецца...) 30
*** (Вечар плыве па двары...) 31
*** (Жыцця шмат дадзена...) 32
*** (Як камень, што ўніз імкне...) 33
*** (За вакном развіваецца клён...) 34
*** (Недзе там, дзе нас няма...) 35
*** (Назірае за намі нехта...) 36
*** (Запрасілі нас у госці...) 38
*** (Бывае, кінем слоўка...) 39
*** (Трава пазелянела на вачах...) 40
Тры фатаграфіі 41
*** (Вечар – гарачае сэрца...) 42
Кропля сну 43
Ноч і месяц 44
Камень 45
Натуршчыца 46
*** (Цяпер, калі разам...) 47
*** (Даўні вечар...) 48
*** (Мокне пушча ў струменях...) 49
Маладыя гадзіны 50

БІБЛІЯТЭКА
Беларускага літаратурнага аб’яднання
“БЕЛАВЕЖА”

---

Серыя заснавана ў 1990 г.

**Кніга шэсцьдзесят першая**

Тэхнічны рэдактар
*Павел Бельскі*

Фота:
*Аляксандр Хомчык*

Sponsor publikacji
**ARGUS**

© Copyright by Jan Czykwin, 2008

ISBN 978-83-60534-79-3

Nr 61

WYDAWNICTWO PRYMAT
Mariusz Śliwowski
Białystok, ul. Zwycięstwa 26C lok. 7
tel. (085) 869 14 87, 0602 766 304
www.prymat.stnet.pl, e-mail: prymat@stnet.pl